**24.** Якім членам сказа з'яўляецца выдзеленае слова ў сказе?

*Кранеш* ***адно*** *– усплывае другое* (Я. Колас).

**А)** дзейнікам. **Б)** выказнікам. **В)** дапаўненнем.
**Г)** азначэннем. **Д)** акалічнасцю.

**25.** Выберыце правільныя сцвярджэнні.

Часціца ***ні*** ўзмацняе адмаўленне, калі ўжываецца:
*1) у няпоўных сказах, калі адсутнічае выказнік з адмоўем;*
*2) у рытарычных сказах, калі адсутнічае выказнік з адмоўем;*
*3) у безасабовых адмоўных сказах пры катэгарычнай забароне якога-небудзь дзеяння.*

**А)** усе сцвярджэнні. **Б)** няма правільных сцвярджэнняў. **В)** 1, 2. **Г)** 1, 3. **Д)** 2, 3.

**26.** Вядомаму класіку літаратуры Янку Брылю падчас наведвання беларускай дэлегацыяй паўднёвай Індыі пашчасціла сустрэцца і пагутарыць з сынам славутага мастака Мікалая Рэрыха Святаславам Мікалаевічам. На памяць аб сустрэчы С. М. Рэрых падарыў пісьменніку … з сандалавага дрэва.

**А)** рыбку. **Б)** слоніка. **В)** дудку. **Г)** лодку. **Д)** птушку.

**27.** Якія назвы з дадзеных напісаны правільна?

*1) Старыя дарогі; 2) балканскі паўвостраў; 3) Давыд-Гарадок; 4) Белае мора.*

**А)** усе назвы. **Б)** няма патрэбных назваў. **В)** 1, 2. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

**28.** Хто з вядомых беларускіх дзеячаў быў ініцыятарам стварэння і першым рэдактарам-выдаўцом легендарнай газеты «Наша ніва», у якой найбольш поўна адлюстроўвалася літаратурнае жыццё Беларусі?

**А)** А. Уласаў. **Б)** Б. Тарашкевіч. **В)** І. Луцэвіч.
**Г)** К. Міцкевіч. **Д)** С. Плаўнік.

**29.** Мабыць, кожны чуў песню:

*Патухаюць, цямнеюць высі,*
*Зоркі ўспыхваюць над сінявой,*
*Да пляча майго прыхініся*
*Залатою сваёй галавой…*

Хто з'яўляецца аўтарам слоў?

**А)** Н. Гілевіч. **Б)** П. Панчанка. **В)** М. Танк. **Г)** В. Зуёнак. **Д)** Г. Бураўкін.

**30.** Верш, які па сваёй будове нагадвае прытчу і спалучае ў сабе апавядальную інтанацыю, філасофскую афарыстычнасць, сюжэтнае развіццё і роздум, называецца … .

**А)** квантэма. **Б)** пункцір. **В)** туюг. **Г)** версэт. **Д)** паліндром.

Арганізатар гульні-конкурсу «Буслік» –
Грамадскае аб'яднанне «Беларуская асацыяцыя «Конкурс»
220045, г. Мінск, вул. Яна Чачота, 16 тэл. (017) 375 66 17, 375 36 23
e-mail: info@bakonkurs.by https://bakonkurs.by/ https://конкурс.бел/

ГА «БА «Конкурс». Заказ 15. Тыраж 11200 экз. г. Мінск. 2020 г.

Гульня-конкурс па беларускай мове і літаратуры

# «БУСЛІК-2020»

*Чацвер, 20 лютага 2020 года*

- працягласць работы над заданнем 1 гадзіна 15 хвілін;
- на кожнае пытанне маецца толькі адзін правільны адказ;
- на старце ўдзельнік атрымлівае авансам 30 балаў;
- кожны правільны адказ адзначаецца трыма, чатырма ці пяццю баламі; колькасць балаў, якія атрымлівае ўдзельнік, адказваючы на пытанне правільна, вызначаецца складанасцю пытання (10 лягчэйшых пытанняў – па 3 балы, 10 найбольш складаных – па 5 балаў, астатнія 10 – па 4 балы); складанасць пытання вызначаецца па колькасці ўдзельнікаў, якія правільна на яго адказалі;
- за няправільны адказ аднімаецца чвэрць балаў, прадугледжаных за дадзенае пытанне, у той час, як не даўшы адказу, удзельнік захоўвае раней набраныя балы;
- максімальная колькасць балаў, якую можа атрымаць удзельнік конкурсу, – 150, аднак аўтары задання не прадугледжваюць яго поўнага выканання ўдзельнікамі, у заданне гульні-конкурсу ўключаны пытанні, веды пра якія не прадугледжаны школьнай праграмай;
- карыстацца падручнікамі, канспектамі, справачнай літаратурай і электроннымі сродкамі забараняецца;
- самастойная і сумленная работа над заданнем – галоўнае патрабаванне арганізатараў да ўдзельнікаў конкурсу; пры парушэнні гэтых патрабаванняў удзельнікі могуць быць дыскваліфікаваны;
- пасля заканчэння конкурсу лісток з заданнем і чарнавік удзельнік забірае з сабой;
- вынікі ўдзельнікаў размяшчаюцца на сайце https://bakonkurs.by/ праз 1–2 месяцы пасля правядзення конкурсу.

## Заданне для вучняў 9 класа

**1.** Колькі ўсяго [т] у словах вершаваных радкоў Яўгеніі Янішчыц?

*Прыедзь у край мой ціхі,*
*Тут продкаў галасы,*
*Тут белыя бусліхі*
*І мудрыя лясы.*

**А)** 0. **Б)** 2. **В)** 3. **Г)** 4. **Д)** 5.

**2.** Якое слова прапушчана ў егіпецкай прымаўцы?

*Усё баіцца часу, а час баіцца … .*

**А)** чалавека. **Б)** пірамід. **В)** фараона. **Г)** пустыні. **Д)** вандроўніка.

**3.** Колькі ўсяго назоўнікаў у форме адзіночнага ліку ўжыта ў вершаваных радках Паўлюка Труса?

*Край балот,*
*нізін, азёраў наскіх,*
*край лясоў,*
*маўклівых сосен-струн…*
*Край паэм,*
*адвечных песень-казак –*
*дарагая сэрцу Беларусь…*

**А)** 4. **Б)** 5. **В)** 8. **Г)** 12. **Д)** 14.

**4.** Якую літару ўставіце на месцы пропуску ў словах?

*1) адажы..; 2) імпрэсары..; 3) сальфеджы.. .*

**А)** а. **Б)** о. **В)** ы. **Г)** э. **Д)** у.

**5.** Хто кім з'яўляецца?

*а) работнік тэатра, які грыміруе артыстаў – ...;* *1) гумарыст;*
*б) аўтар або выканаўца гумарыстычных твораў – ...;* *2) гурман;*
*в) аматар і знаток далікатных страў – ...* *3) грымёр.*

**А)** а-1, б-2, в-3. **Б)** а-1, б-3, в-2. **В)** а-2, б-3, в-1. **Г)** а-3, б-1, в-2. **Д)** а-3, б-2, в-1.

---

**6.** Які з дадзеных займеннікаў не мае формы назоўнага склону?

**А)** табе. **Б)** сабе. **В)** мне. **Г)** некага. **Д)** свайго.

---

**7.** Якое з прапанаваных слоў напішаце асобна?

*1) (што)тыдзень; 2) (збожжа)здача; 3) (кансалтынг)анлайн.*

**А)** усе словы. **Б)** няма патрэбнага слова. **В)** 1. **Г)** 2. **Д)** 3.

---

**8.** Дадзены словы: *1) він..етка; 2) він..ціць; 3) віл..чык; 4) валяр..ян.*

У якіх прыкладах на месцы пропуску напішаце ***ь*** (мяккі знак)?

**А)** ва ўсіх прыкладах. **Б)** няма патрэбных прыкладаў. **В)** 1, 3. **Г)** 2, 4. **Д)** 3, 4.

---

**9.** Якія з дадзеных дзеясловаў напісаны няправільна ў форме 2 асобы множнага ліку цяперашняга часу?

*1) робеце; 2) сеецe; 3) сервіруіце; 4) схопіце.*

**А)** усе дзеясловы. **Б)** няма патрэбных прыкладаў. **В)** 1, 3. **Г)** 2, 4. **Д)** 3, 4.

---

**10.** Выберыце сказ, у якім на месцы пропуску паставіце двукроп’е.

*1. На ўскрайку Кобрына да нашых дзён захаваўся канал Бона _ самы старажытны меліярацыйны канал у Беларусі.*
*2. Ужо каторы дзень шуміць вецер _ імжыць халодны восеньскі дождж.*
*3. Данілаўна на хвіліну задумалася і ўспомніла _ частым і доўгім кукаваннем зязюля ўказвае на ўстанаўленне цёплых дзён.*

**А)** усе сказы. **Б)** няма патрэбнага сказа. **В)** 1. **Г)** 2. **Д)** 3.

---

**11.** *Той, хто паступае ў сярэднюю спецыяльную або ў вышэйшую навучальную ўстанову,* называецца… .

**А)** выпускнік. **Б)** практыкант. **В)** абітурыент. **Г)** асістэнт. **Д)** аспірант.

---

**12.** Якія прыслоўі з прапанаваных утвораны прыставачна-суфіксальным спосабам?

*1) таксама; 2) цёмна-цёмна; 3) упустую; 4) па-трэцяе.*

**А)** усе прыслоўі. **Б)** няма патрэбных прыслоўяў. **В)** 1, 2. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

---

**13.** Вызначце няправільна ўтвораныя словазлучэнні.

*1) даравацъ яго; 2) пайсці па хлеб; 3) хварэць грыпам; 4) жартаваў з сябра.*

**А)** усе прыклады. **Б)** няма патрэбных прыкладаў. **В)** 1, 3. **Г)** 2, 4. **Д)** 3, 4.

---

**14.** Напэўна, вы з цікавасцю чыталі ў свой час творы:

*1) “Мэры Кэт”; 2) “Незагойная рана”; 3) “Настаўнік чарчэння”;*
*4) “Сірочы хлеб”; 5) “Меч князя Вячкі”.*

Хто з’яўляецца аўтарам кожнага з іх?

*а) Янка Брыль; б) Васіль Быкаў; в) Леанід Дайнека;*
*г) Мікола Лупсякоў; д) Іван Навуменка.*

**А)** 1-а, 2-в, 3-б, 4-г, 5-д. **Б)** 1-б, 2-д, 3-а, 4-в, 5-г. **В)** 1-в, 2-а, 3-г, 4-д, 5-б.
**Г)** 1-г, 2-б, 3-д, 4-а, 5-в. **Д)** 1-д, 2-г, 3-в, 4-б, 5-а.

**15.** Выберыце з дадзеных словы з прыстаўкай.

*1) удасканальваць; 2) абіўка; 3) сняжынка.*

**А)** усе словы. **Б)** няма патрэбных слоў. **В)** 1, 2. **Г)** 1, 3. **Д)** 2, 3.

---

**16.** Якія лічэбнікі з прапанаваных правільна напісаны?

*1) пяцьсоты; 2) чацьвёрты; 3) шасты.*

**А)** усе лічэбнікі. **Б)** няма патрэбных лічэбнікаў. **В)** 1, 2. **Г)** 1, 3. **Д)** 2, 3.

---

**17.** Вызначце аднасастаўныя сказы.

*1) Падарыла восень людзям багаты ўраджай.*
*2) Адной рукой і вузла не завяжаш.*
*3) Прыемна ўсё ж глядзець на квецень садоў вясной!*

**А)** усе сказы. **Б)** няма патрэбных сказаў. **В)** 1, 2. **Г)** 1, 3. **Д)** 2, 3.

---

**18.** Якія дзеясловы з дадзеных маюць у форме другой асобы множнага ліку цяперашняга часу канчаткі ***-іце(-ыце)***?

*1) хваліць; 2) бачыць; 3) чытаць; 4) браць.*

**А)** усе дзеясловы. **Б)** няма патрэбных дзеясловаў. **В)** 1, 2. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

---

**19.** Які(-ія) знак(-і) прыпынку неабходна паставіць на месцы пропуску ў сказе?

*«Якое шчасце – жыць на белым свеце, піць водар траў і цішыню бароў, твар падстаўляць пад чабаровы вецер і мець сям’ю, работу і сяброў, – прачытаў з захапленнем Антось сябрам і дадаў_ Гэта радкі Генадзя Бураўкіна!»*

**А)** коску, працяжнік. **Б)** двукроп’е, працяжнік. **В)** коску.
**Г)** працяжнік. **Д)** кропку, працяжнік.

---

**20.** У напісанні якога слова з прапанаваных дапушчана памылка?

*1) ушчуваць; 2) рашчуліць; 3) ушчыкнуць.*

**А)** у напісанні ўсіх слоў. **Б)** усе словы напісаны правільна. **В)** 1. **Г)** 2. **Д)** 3.

---

**21.** Выберыце правільныя сцвярджэнні:

*1) лічэбнік паўтара ўжываецца з назоўнікамі мужчынскага роду;*
*2) лічэбнік паўтара ўжываецца з назоўнікамі жаночага роду;*
*3) лічэбнік паўтара ўжываецца з назоўнікамі ніякага роду;*
*4) лічэбнік паўтары ўжываецца з назоўнікамі мужчынскага роду;*
*5) лічэбнік паўтары ўжываецца з назоўнікамі жаночага роду;*
*6) лічэбнік паўтары ўжываецца з назоўнікамі ніякага роду.*

**А)** усе сцвярджэнні. **Б)** 1, 3, 5. **В)** 1, 5. **Г)** 2, 4, 6. **Д)** 3, 4.

---

**22.** Суаднясіце ўстойлівыя выразы на рускай і беларускай мовах.

*1) видно птицу по полету; 2) видит око, да зуб неймет;*
*3) Федот да не тот; 4) из уст в уста.*
*а) Саўка, ды не ў тых санках; б) блізка відаць, ды далёка дыбаць;*
*в) з вуха на вуха; г) відаць пана па халявах.*

**А)** 1-а, 2-б, 3-в, 4-г. **Б)** 1-б, 2-а, 3-г, 4-в. **В)** 1-б, 2-г, 3-в, 4-а.
**Г)** 1-г, 2-б, 3-а, 4-в. **Д)** 1-в, 2-г, 3-б, 4-а.

---

**23.** Выберыце спалучэнні з правільна напісанымі прыметнікамі.

*1) недарэчны выпадак; 2) не прытульны дом; 3) невысокая сасна.*

**А)** усе прыклады. **Б)** няма патрэбных прыкладаў. **В)** 1, 2. **Г)** 1, 3. **Д)** 2, 3.